За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 2 (73) Люты 2013 г.

Актывістам «Хвалі Салідарнасьці» прызначылі штафы па 3 мільёны кожнаму

16 лютага каля апоўдня ў Віцебску былі затрыманыя сябры аргкамітэту па стварэні партыі БХД Стас Лаўрэнаў і Аляксей Кішчук. Іх затрымалі ў цэнтры гораду ля Плошчы Свабоды пасьля таго, як яны вывесілі расьцяжку “Свабоду палітвязьням". Па затрыманьні хлопцаў адвезьлі ў Кастрычніцкі РАУС Віцебску.

Пазьней Аляксей Кішчук здолеў паведаміць Тацьцяне Севярынец, што іх вязуць у ізалятар часовага ўтрыманьня, дзе будуць утрымліваць да суду. Суд, паведаміў актывіст, адбудзецца ў панядзелак. У дзень затрыманьня Стасу Лаўрэнаву споўнілася 20 год. Сустрэў ён свой дзень народзінаў у ІЧУ.

Выходныя актывісты БХД правялі ў ізалятары часовага ўтрыманьня. Судовае паседжаньне па адміністрацыйнай распачалося 18 лютага. Ім прад'явілі абвінавачаньне паводле арт. 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

Пасьля таго, як затрыманыя запатрабавалі адвакатаў, судзьдзёй Інай Грабоўскай было прынятае рашэньне прыпыніць разгляд справы. Новае судовае паседжаньне было прызначанае на 21 лютага.

Праз 3 дні разбор справы быў працягнуты. **Адвакат знайшоў у матэрыялах справы мноства працэсуальных парушэньняў, дапушчаных супрацоўнікамі міліцыі. У прыватнасьці, міліцыянты для “аб'ектыўнасьці" прыплялі да матэрыялаў справы жанчыну, якая нібыта была сьведкам затрыманьня, паведаміла віцебская каардынатарка БХД Тацьцяна Севярынец, якую за спробу сфатаграфаваць рэчавыя доказы выдалілі з залі суду.**



У сваю чаргу сьведка з боку падабаронных заявіў, што міліцыянты, затрымліваючы актывістаў, парушылі ўсе магчымыя правілы дарожнага руху, едучы на машыне па тратуары. Пададзенае міліцыянтамі відэа затрыманьня ня выявіла ніякіх пярэчньняў са словамі сьведкі пра дзеяньні міліцыянтаў. **У выніку судзьдзя прысудзіла актывістам штраф у памеры 30 базавых велічынь кожнаму. Аднак сябры БХД маюць намер абскарджваць гэты прысуд.**

Адзначым, што Лаўрэнаў і Кішчук самі высунулі міліцыянтам сустрэчную позву за незаконнае ўтрыманьне ў ІЧУ — маральную шкоду яны ацанілі ў 15 і 14 тыс. эўра адпаведна. “Хлопцы трымаліся на судзе бадзёра, паводзіліся годна", - адзначыла Тацьцяна Севярынец.

“Хваля салідарнасьці" ў падтрымку палітвязьняў БХД праходзіць у фармаце штодзённага марафону ў розных гарадох Беларусі з 13 лютага. Актывісты распаўсюджваюць улёткі і плакаты з інфармацыяй пра палітвязьняў па паштовых скрынях, расклейваюць на стэндах дамоў, раздаюць паштоўкі з заклікам падпісаць іх і пераслаць палітзьняволеным. Яны таксама вывешваюць расьцяжкі з заклікам да вызваленьня палітвязьняў. ***Акцыя “Хваля салідарнасьці" завершыцца ў Дзень Волі 25 сакавіка.***

Дырэктар тэлевізіі паскардзіўся абласному кіраўніку БНФ на брак грошай



Дырэктар ТРК «Віцебск» **Анатоль Камовіч** падзякаваў старшыні Віцебскай абласной рады партыі БНФ **Леаніду Аўтухову**: «Вялікі дзякуй Вам за ўвагу да этэру нашай тэлерадыёкампаніі. Ваша прапанова вельмі слушная, але ж стварэньне новых праектаў у гэтым годзе кампаніяй не заплянаванае з прычыны недахопу фінансавых сродкаў». Гэтак галоўны тэлевізійнік Віцебшчыны адказаў на зварот мясцовага лідэра БНФ з прапановай аб стварэньні праграмы грамадзка-палітычнага накірунку.

У сваім звароце да чыноўніка Леанід Аўтухоў адзначаў, што грамадзянам краіны не хапае такой праграмы, у якой прадстаўнікі ўсіх зарэгістраваных грамадзкіх і палітычных арганізацыяў маглі б прадставіць сваё бачаньне сёньняшніх рэаліяў, выказаць свае крытычныя заўвагі і абмеркаваць праблемы з запрошанымі службовымі асобамі розных узроўняў. Гэткая праграма, на думку спадара Аўтухова, набыла б найвышэйшы рэйтынг і дапамагла б вырашыць некаторыя застарэлыя праблемы Віцебску і вобласьці.

Мяркуючы па адказе кіраўніка віцебскай тэлерадыёкампаніі, ён нібыта цалкам падтрымлівае прапанову віцебскага старшыні БНФ, але ня можа нічога зрабіць з-за браку фінансаў. *Дык, мабыць, грамадзянам, якія хочуць пачуць голас прадстаўнікоў партыяў і грамадзкіх рухаў з тэлеэкранаў, варта ўкласьці ў справу ўласныя грошыкі ды распачаць збор ахвяраваньняў на ўвасабленьне «слушнай прапановы» БНФ у жыцьцё?*

Сьледчы камітэт «крышуе» судзьдзяў?

*Прававі інспэктар прафсаюзу РЭП **Валер Місьнікаў** ад імя прафсаюзнай арганізацыі зьвярнуўся да старшыні Сьледчага камітэту Рэспублікі Беларусь з заявай аб узбуджэньні крымінальнай справы ў дачыненьні да судзьдзі Чыгуначнага райсуду Віцебску **Сьвятланы Варатынскай**. Сьледчы камітэт ня стаў разглядаць заяву і выносіць працэсуальны дакумэнт, прадугледжаны КПК, а адказаў адпіскай, у якой начальнік аддзелу па працы са зваротамі грамадзян **С. Тухто** паведаміў спадару Місьнікаву, што зварот пакінуты без разгляду па сутнасьці.*



У заяве ў Сьледчы камітэт адзначалася, што судзьдзя Варатынская, разглядаючы пазоўныя заявы сябраў прафсаюзу РЭП супраць наймальніка, парушыла шэраг артыкулаў грамадзянска-працэсуальнага кодэксу і закону РБ «Аб прафэсійных саюзах». Прафсаюз угледзеў у дзеяньнях судзьдзі наяўнасьць прыкметаў складу злачынства, прадугледжанага артыкуламі 190 (парушэньне раўнапраўя грамадзян), 395 (фальсыфікацыя доказаў) і 424 (злоўжываньне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі) Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь, таму і была складзеная заява ў Сьледчы камітэт.

Сьледчы камітэт наогул ня стаў разьбірацца ў абгрунтаванасьці прэтэнзіяў да судзьдзі. Цікава, што адказ Сьледчага камітэту быў накіраваны не на адрас прафсаюзу, на фірмовым блянку якога была аформленая заява, а на хатні адрас прафсаюзнага юрыста. Прычым заява была разгледжаная ў адпаведнасьці не з крымінальна-працэсуальным кодэксам, а чамусьці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб».

Валер Місьнікаў кажа, што зварот ягонага прафсаюзу ў Сьледчы камітэт — не адзінкавы выпадак на Віцебшчыне і ў краіне, калі нехта просіць прыцягнуць да адказнасьці судзьдзяў. Яму вядома пра факты зваротаў грамадзян у пракуратуру і Сьледчы камітэт з заявамі аб узбуджэньні крымінальных справаў наконт грамадзка-небясьпечных дзеяньняў, учыненых судзьдзямі. Але ўсе звароты пакідаюцца без належных працэсуальных дакумэнтаў: «На зварот не даецца адказ, які прадугледжаны КПК, а менавіта не даецца пастанова. Пішуцца паведамленьні, тлумачэньні, адпіскі, але ні ў якім разе не вырашаецца пытаньне так, каб потым адказ можна было абскардзіць у судовым парадку».

«Цягам доўгага часу Прафсаюз працаўнікоў радыёэлектроннай прамысловасьці ня можа дагрукацца да Сьледчага камітэту наконт пытаньня ўзбуджэньня крымінальнай справы ў дачыненьні да судзьдзі, якая сьвядома вынесла незаконнае вызначэньне. На абарону судзьдзі ўсталі абсалютна ўсе дзяржаўныя адказныя службовыя асобы: пракуроры, Сьледчы камітэт. І нават зварот у адміністрацыю прэзыдэнта выніку ня даў», — распавёў юрыст прафсаюзу РЭП.

«Тыя службовыя асобы, якія пакрываюць судзьдзяў, самі падпадаюць пад дзеяньне крымінальнага закону. Таму ў адносінах да іх ужо пастаўленыя пытаньні перад кампэтэнтным органам аб узбуджэньні крымінальных справаў за парушэньні імі законаў Рэспублікі Беларусь і Канстытуцыі. Гэтыя парушэньні спрычыніліся да парушэньня правоў і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб», — паведаміў Валер Місьнікаў.

Актывіст КХП-БНФ прайграў суд супраць ЖКГ

У Кастрычніцкім райсудзе Віцебску завяршыўся разгляд грамадзянскай справы паводле пазову сябра КХП-БНФ Яна Дзяржаўцава супраць намесьніка гендырэктара УКВП «Віцебская гарадзкая ЖКГ» Вадзіма Ільінца. На думку палітыка, чыноўнік, не заключыўшы зь ім дамову на прыборку тэрыторыі пасьля правядзеньня меркаванага шэсьця і мітынгу, парушыў яго грамадзянскія і палітычныя правы ды прычыніў яму маральную шкоду. Судзьдзя Вікторыя Лешчанка пазоў аб кампэнсацыі маральнай шкоды не задаволіла.



Не было задаволенае і другое патрабаваньне пазоўнай заявы: вынесьці асобнае вызначэнне ў дачыненьні да Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту аб неабходнасьці ўзмацненьня кантролю над выкананьнем патрабаваньняў дырэктывы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 2.

У згаданай дырэктыве гаворыцца: *«Фармалізм, цяганіна, паператворчасьць, фанабэрыя, непавага да людзей, абыякавасьць да іх лёсу і патрэб, якія праяўляюць некаторыя чыноўнікі, пра што сьведчаць звароты грамадзян, што паступаюць на разгляд кіраўніка дзяржавы, падрываюць іх давер да дзяржавы. Такі стан спраў недапушчальны».*

Ян Дзяржаўцаў вымушаны быў зьвярнуцца ў суд пасьля таго, як у якасьці адказу на заяву ў «Віцебскую гарадзкую жыльлёва-камунальную гаспадарку» наконт заключэньня дамовы аб прыборцы тэрыторыі пасьля правядзеньня масавага мерапрыемства атрымаў чарговую адпіску за подпісам Вадзіма Ільінца. Апошні папросту «адфутболіў» заяўніка: напісаў, што па заключэньне дамоваў трэба зьвяртацца не ў яго прадпрыемства, а ў іншыя арганізацыі — «Гардармост» і «Зелянгас».

Існуе такое рашэньне Віцебскага гарвыканкаму — № 881: калі нехта хоча зладзіць мітынг, пікет ці вулічнае шэсьце — яму да заявы аб правядзеньні масавага мерапрыемства трэба прыкласьці копіі дамоваў аб прыбіраньні тэрыторыі з УКВП «Віцебская жыльлёва-камунальная гаспадарка» (а не зь нейкімі «Гардармостам» і «Зелянгасам», пра якія напісаў Ільінец), а таксама з мэдыкамі і міліцыянтамі аб абслугоўваньні падчас мерапрыемства.

Дамагчыся заключэньня патрэбных дамоваў з названымі службамі ня здолеў яшчэ ніхто. У выніку з-за невыкананьня рашэньня № 881 усе акцыі апазыцыянэраў, праваабаронцаў і грамадзкіх актывістаў, аб дазволе на якія падаюцца заяўкі, ужо цягам некалькіх год забараняюцца мясцовымі ўладамі.

Так здарылася і чарговым разам. Каб зладзіць акцыю, заплянаваную на 7 лістапада 2012 году, Ян Дзяржаўцаў папрасіў УКВП «Віцебская жыльлёва-камунальная гаспадарка» і іншыя службы заключыць зь ім дамовы, безь якіх аніяк не атрымаць дазволу на правядзеньне акцыі. Адбылося, як заўсёды: ніхто, спасылаючыся на розныя прычыны, дамоваў заключаць ня стаў. Вынік прадказальны: з прычыны адсутнасьці дамоваў гарвыканкам акцыю забараніў.

Ян Дзяржаўцаў лічыць, што калі існуе рашэньне гарвыканкаму № 881, дык яго павінны выконваць ня толькі грамадзяне, што хочуць зладзіць масавае мерапрыемства, але і ўстановы, пералічаныя ў рашэньні, зь якімі неабходна заключаць дамовы. На яго думку, і ЖКГ, і міліцыя, і лекары, адмаўляючыся заключаць дамовы, парушаюць правы грамадзян, гарантаваныя Канстытуцыяй і міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, бо з-за іх адмоваў няможна праводзіць мірных сходаў.

«Груба парушыўшы дзеючае заканадаўства, намесьнік генэральнага дырэктара УКВП "Віцебская гарадзкая жыллёва-камунальная гаспадарка" В.І. Ільінец пазбавіў мяне магчымасьці падаць у Віцебскі гарадзкі выканаўчы камітэт дамову на прыборку тэрыторыі пасьля правядзеньня масавага мерапрыемства. Адсутнасьць гэтай дамовы паслужыла прычынай адмовы мне ў правядзеньні шэсьця і мітынгу», — напісаў Ян Дзяржаўцаў у сваёй пазоўнай заяве.

«Я, зьяўляючыся даўнім і пасьлядоўным змагаром з праявамі шкоднаснай камуністычнай ідэалёгіі, імкнуся, па магчымасьці, публічна і адкрыта даносіць да жыхароў гораду Віцебску праўду аб злачынствах камуністычнага рэжыму супраць чалавечнасьці. Таму пазбаўленьне мяне гэткай магчымасьці прычыніла мне маральныя страты ў выглядзе нерэалізаванага жаданьня публічна выказаць свае палітычныя погляды, прадэманстраваць сваю прыналежнасьць да антыкамуністычнага руху. Сваім незаконным рашэньнем намесьнік генэральнага дырэктара УКВП "Віцебская гарадзкая жыллёва-камунальная гаспадарка" В.Р. Ільінец парушыў мае грамадзянскія і палітычныя правы», — гэтак абгрунтаваў Ян Дзяржаўцаў свой пазоў.

Невядома, чым кіравалася судзьдзя Лешчанка, прымаючы рашэньне. Але відавочна, што сваім рашэньнем яна развязала рукі чыноўнікам і дала ім магчымасьць надалей на ўласны одум не заключаць дамоваў з палітычнымі і грамадзкімі актывістамі на абслугоўваньне масавых мерапрыемстваў і пазбаўляць іх тым самым права ладзіць мірныя сходы і публічна выказваць свае думкі.

Жыхары Віцебску працягваюць скардзіцца ў Камітэт па правох чалавека



Камітэт па правох чалавека ААН зарэгістраваў скаргу віцебскай кардынатаркі аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Тацьцяны Севярынец. Нагодай для звароту ў КПЧ ААН стала рашэньне суду Кастрычніцкага раёну Віцебску паўтарагадовай даўнасьці, згодна зь якім актывістка нібыта парушыла закон аб масавых мерапрыемствах, за што была пакараная штрафам у памеры 20 базавых велічынь.

Лета 2011 году запомнілася шмат каму зь беларусаў акцыямі «Рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі», хваля якіх пракацілася тады па гарадох краіны. 3 ліпеня, у афіцыйны «Дзень Незалежнасьці», адна з такіх акцыяў маўклівага пратэсту адбылася і ў Віцебску. Больш за сотню жыхароў гораду прайшлі па цэнтральных вуліцах, пляскаючы ў ладкі. Сярод іх была і Тацьцяна Севярынец. Потым была супольная малітва за Беларусь на Ўсьпенскай горцы. А праз тыдзень адбыўся суд: судзьдзя Яўген Буруноў прызнаў Тацьцяну Севярынец арганізатарам несанкцыянаванага вулічнага шэсьця і прыцягнуў яе да адміністрацыйнай адказнасьці.


На думку спадарыні Тацьцяны, рашэньне судзьдзі Бурунова зьяўляецца беспадстаўным. Бо ніякага арганізаванага вулічнага шэсьця, на якое трэба пытаць дазволу ва ўладаў, у той дзень не было. Ніхто з тых, хто ішоў на малітву, не выходзіў на праезную частку, не трымаў у руках сьцягоў, плякатаў або іншых агітацыйных матэрыялаў. Ісьці ж па ходніках, пляскаць у ладкі і маліцца законам не забаронена.

Тацьцяна Севярынец абскардзіла рашэньне судзьдзі Бурунова, але ні віцебскі абласны, ні Вярхоўны суды не прыслухаліся да аргумэнтаў актывісткі. Цяпер вырашаць, ці ёсьць парушэньнем правоў, гарантаваных Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правох, прыцягненьне яе да адказнасьці за рух групы грамадзян да месца малітвы, за саму малітву і за аплядысмэнты будзе Камітэт па правох чалавека ААН.

Па факце зьбіцьця віцебскага актывіста БНФ узбуджаная крымінальная справа

Пракурор Першамайскага раёну Віцебску старшы дарадца юстыцыі **Юры Раманоўскі**, разглядзеўшы матэрыялы праверкі па факце прычыненьня цялесных пашкоджаньняў сябру партыі БНФ **Аляксею Гудзіліну**, прыняў пастанову аб узбуджэньні крымінальнай справы паводле артыкулу 153 КК. Такая пастанова была прынятая пасьля заявы ў пракуратуру Віцебскай вобласьці старшыні віцебскай абласной рады партыі БНФ Леаніда Аўтухова з просьбай да пракурора ўзяць пад асабісты кантроль бесстароннасьць, апэратыўнасьць, паўнату і выніковасьць сьледча-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўных органаў па выяўленьні і прыцягненьні да адказнасьці вінаватых.

Нагадаем, сябра партыі БНФ Аляксей Гудзілін быў зьбіты 14 сьнежня 2012 году. На яго напалі двое невядомых мужчын магутнага целаскладу, якія вонкава і паводзінамі нагадвалі супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Адзін зь іх мімаходзь паказаў нейкі дакумэнт, падобны да пасьведчаньня праваахоўніка. Невядомыя сілай узялі актывіста пад рукі, падвялі да машыны, прымусілі сесьці ў салён, а самі разьмясьціліся па абодва бакі ад яго. У машыне таксама знаходзіўся кіроўца.



На пытаньні хлопца, што адбываецца, быў адказ: **«Не хадзі ў БНФ і не займайся тымі рэчамі, што цябе ня тычацца, а то лезеш і ў тэлевізар, і ў газэты...»** Пасьля гэтага той, хто сядзеў праваруч, двойчы ўдарыў актывіста кулаком у твар. З носа пацякла кроў. Зьбітага маладога чалавека нападнікі выкінулі з машыны, а самі зьніклі ў невядомым напрамку. У той самы дзень «Хуткая дапамога» даставіла Аляксея Гудзіліна ў абласны шпіталь, дзе лекарамі быў выстаўлены дыягназ «Закрыты пералом костак носу».

Як адзначаецца ў пастанове пракурора, справы наконт злачынстваў, прадугледжаных артыкулам 153 Крымінальнага кодэксу (наўмыснае прычыненьне лёгкага цялеснага пашкоджаньня), зьяўляюцца справамі прыватнага абвінавачаньня і ўзбуджаюцца асобамі, што пацярпелі ад злачынства. Аднак пракурор мае права таксама ўзбуджаць такога кшталту справы, нават пры адсутнасьці заявы пацярпелага, калі дзеяньні вінаватай асобы закранаюць істотныя інтарэсы дзяржавы і грамадзтва, законныя інтарэсы грамадзян. Менавіта з гэтага свайго права і скарыстаўся пракурор Юры Раманоўскі.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта «Віцебская вясна» і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.